**Заключение.** Культурные ценности, идеи гуманизма белорусского общества органично зазвучали в контексте всей европейской культуры. Видимо, поэтому XVI век называют «золотым веком» Беларуси. В культуре ВКЛ, старобелорусском языке тесно переплелись восточные и западные традиции. В этот период в типографиях издавались сотни оригинальных и переводных книг просветительского, духовного и полемического характера, учебные пособия. Использование достижений западноевропейской ренессансной культуры вводило белорусов в общеевропейский культурный контекст.

Список литературы


1. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – 2-е изд. – Мінск, 1997. – 486 с.
2. Языковая ситуация в Беларуси: этические коллизии двуязычия - kamunikat.fontel.net/www/knizki/brama/prastora/prastora_01.htm // Сацыякультурная прастора мовы (сацыяльныя і культурныя аспекты вывучэння беларускай мовы): На бел. і рус. мовах / С. Ф. Іванова, Я. Я. Іваноў, Н. Б. Мячкоўская. – Мн.: Веды, 1998.


## БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР У РАМАНЕ У. ГНІЛАМЁДАВА “ВАЙНА”


*В.І. Русілка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


Выдатны беларускі літаратуразнаўца і пісьменнік, доктар філалагічных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў сёлета адзначае свой 80-дзесяцігадовы юбілей, што надае асаблівую актуальнасць даследаванням, у якіх асэнсоўваецца яго ўклад не толькі ў развіццё беларускай навукі, але і ў сучасны літаратурны працэс. Проза У. Гніламёдава дае багаты фактычны матэрыял для разумення найноўшых тэндэнцый у развіцці эпічных жанраў і магчымасцей класічнага рамана ў глыбокамастацкім ўвасабленні духоўна-маральных асноў нацыянальнага характару беларуса.

Мэта дадзенай работы – выяўленне спецыфікі мастацкай рэпрэзентацыі нацыянальнага характару ў рамане У. Гніламёдава “Вайна”, прысвечаным самаму маштабнаму і трагічнаму выпрабаванню XX стагоддзя – Вялікай Айчыннай вайне.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання стаў раман У. Гніламёдава “Вайна”, у прыватнасці, эпічныя сродкі стварэння народнага характару. У навуковым аналізе выкарыстаны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, фенаменалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Дзесяць гадоў таму У. Гніламёдаў паставіў перад сабой надзвычай важную і маштабную мэту: адлюстраваць лёс беларускага сялянства на працягу XX стагоддзя праз гісторыю роду Лявона Кужаля, прататыпам якога стаў дзед пісьменніка Лявонцій Міхайлавіч Сцепанюк. У выніку напружанай і плённай працы выйшлі з друку ўжо шэсць раманаў гістарычнай хронікі, кожны з якіх стаў чаканай і істотнай з’явай у сучаснай беларускай літаратуры (трэба падкрэсліць, што падобнага значнага цыклу класічных твораў “вялікага жанру” ў сучаснай беларускай літаратуры няма): “Уліс з Прускі” (2006), “Расія” (2007), “Вяртанне” (2008), “Валошкі на мяжы” (2014, часопісны варыянт у 2009-2011 г.), “Вайна” (2014), “Пасля вайны”(“Полымя”, 2014, №11,12; 2015, №4, 5, 6, 7).

Раман “Вайна” ў часопісным варыянце меў назву “Ліхалецце”, якую аўтар замяніў на болей канкрэтную і болей звязаную з назвай наступнага рамана. Ды і канцэптуальна, відаць, ліхалеццем можна назваць не толькі 1941-1945 г., але і гады сталінскіх рэпрэсій, якія закранулі і род Кужаляў.

Тэма ўсенароднага змагання з фашызмам дае ўнікальныя магчымасці для паглыблення ў сутнасць народнага характару, выяўлення яго маральных асноў, якія ў звычайным побытавым жыцці не заўсёды з’яўляюцца відавочнымі.

Уздымаючы ў сваёй гістарычнай хроніцы выключна важныя праблемы жыцця народа, У. Гніламёдаў пастаянна трымае ў полі зроку пытанне пра адметнасць беларусаў як нацыянальнага тыпу. У нядаўнім інтэрв’ю для газеты “Літаратура і мастацтва”, праведзеным Алесяй Лапіцкай, пісьменнік выказаўся найбольш поўна і ў нейкай ступені нечакана: “Кажуць, што беларусы цягавіты, пакладзісты народ – і гэта сапраўды так. Вядома, беларусы талерантныя. Беларусы спакойна ставяцца да магчымасці атрымаць вышэйшы чын, ім не ўласцівы кар’ерызм… Беларусам не хапае пачуцця адзінства, карпаратыўнасці. Душэўнасць ёсць, беларусы адгукнуцца на просьбу дапамагчы, але ўвогуле яны адасобленыя, індывідуалісты. Калі казаць пра светаўспрыманне, то беларусы любяць абмацваць свет. Іх успрыманне не абстрактнае, не спірытуалізаванае. Рэчыўнасць, прадметнасць, катэгарычнасць



Репозиторий ВГУ

вызначаюць сакавітасць мовы" [1, с. 9]. У рамане "Вайна" ў пэўнай ступені рэалізуюцца гэтыя ідэйныя ўстаноўкі аўтара: на пачатку акупацыі большасць жыхароў палескай вёскі Пруска спадзяецца, што бяду можна неяк ціха перасядзець, а з фашыстамі паразумецца, пра што сведчаць шматлікія дыялогі вяскоўцаў. Душэўнасць як рыса нацыянальнага характару ярка выяўляецца ва ўчынку Лявона Кужаля, які, пашкадаваўшы акружэнца-сібірака Саньку Растатуева, не толькі пакарміў яго, але і ўзяў да сябе ў сям'ю і паручыўся за яго ўласным жыццём. Праўда, перад гэтым добра падумаў і ўзважыў магчымыя наступствы, пра што сведчаць унутраныя маналогі героя, асабліва частыя ў гэтай частцы гістарычнай эпапеі. Учынак Лявона паўтарылі многія прускаўцы. Вайна мяняе настрой і паводзіны людзей: "Інстынктыўна прускаўцы, можна было бачыць, шчыльней згуртаваліся паміж сабой, сталі, як здавалася Лявону, больш зычлівымі, але і насцярожанымі" [2, с. 44]. Паступова ў вёску прыходзяць звесткі пра жорсткасць і бесчалавечнасць акупантаў (пісьменнік не апісвае трагічныя падзеі падрабязна, а падае іх праз трапныя эмацыянальна насычаныя дэталі, як у выпадку забойства жанчыны з маленькім дзіцём), расце супраціўленнне акупантам, узнікае партызанскі рух. І ў гэтай сувязі на першы план выходзіць іншае сцвярджэнне У. Гніламёдава пра сутнасць беларускага нацыянальнага характару, выказанае ў інтэрв'ю з Марынай Весялуха : "Нашы продкі – цікавы пасіянарны народ" [3, с.18]. Пасіянарнасць як рыса беларусаў выразна выяўляецца менавіта ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны. Не можа не даць прытулак партызанам Аграфена, якая гіне разам з нешматлікім атрадам імя таварыша Тэльмана, паступова ўступаюць у барацьбу і іншыя прускаўцы. Змагаецца з фашыстамі ў партызанах, а потым і на фронце Васіль, прыёмны сын Кужаля, які ўжо і сам мае траіх дзяцей. Нягледзечы на жорсткія карныя акцыі, на спаленыя разам з жыхарамі вёскі, на тое, што і прускаўцаў сагналі на выгане для расстрэлу, які толькі цудам быў не выкананы, супраціўленне фашыстам толькі ўзмацняецца, перарастаючы са стыхійнага імкнення выжыць у свядомую і арганізаваную барацьбу. Словамі свайго героя Павала Гальяша пісьменнік падкрэслівае глыбінныя сілы народнага характару: "Нас можна зваяваць, але намі цяжка ўладарыць. Мы славяне… Мы як бы і ціхія, але і скрозь камень праб'емся" [2, с. 42 ].

Як падкрэсліў І. Шаладонаў, аснову маральна-эстэтычнай канцэпцыі рамана У. Гніламёдава "Вайна" складае катэгорыя сабонасці – "сутнаснае анталагічна-каштоўнаснае паняцце, якое пазначае унутраную непарыўную духоўную сувязь у у трыядзе: *чалавек – народ – Бог*" [4, с. 14]. Вайна ўзмацняла не толькі індывідуальны страх смерці і трывогу за сям'ю, але і пачуццё калектыўнай адказнасці (за ўчынак аднаго каралі ўсю вёску) і веру ў Бога, на Якога толькі і заставалася спадзявацца ў крытычных сітуацыях.

Для стварэння пераканальных вобразаў-персанажаў У. Гніламёдаў выкарыстоўвае апрабаваныя ў папярэдніх раманах сродкі мастацкай выразнасці: найперш характарыстыку героя праз учынак, які апісваецца ў падрабязных побытавых і псіхалагічных дэталях; унутраныя маналогі, няўласна-простую мову героя, якія надаюць пераканальнасць вобразу; індывідуалізацыю мовы героя і яго выразны партрэт, у якім часта падкрэсліваецца нацыянальная адметнасць адзення (да прыкладу, шапка-магерка, ці канфедэратка, у вечнага падарожніка Кузёмкі). Дарэчнае выкарыстанне гэтых і іншых мастацкіх прыёмаў сведчыць пра высокі ўзровень майстэрства празаіка.

**Заключэнне.** У рамане "Вайна" У. Гніламёдаў даследуе важныя рысы нацыянальнага беларускага характару, што выявіліся ў крытычны для нацыі момант: трываласць, цярплівасць, душэўнасць, ахвярнасць, пасіянарнасць і сабонасць. Пісьменнік працягвае працу над гістарычнай хронікай, што дае падставы спадзявацца на новыя адкрыцці ў галіне рэпрэзентацыі духоўных асноў беларускага народа.

Спіс літаратуры

1. Гніламёдаў, У. В. Сем гадоў у пшанічным краі: Да гісторыі стварэння рамана "Расія" У. Гніламёдава / У. В. Гніламёдаў; гутарыла А. Лапіцкая. – Літаратура і мастацтва. – 2016. – 27 мая. – С. 9.
2. Гніламёдаў, У. В. Вайна : раман / У. В. Гніламёдаў. – Мінск: Беларус. навука, 2014. – 628.
3. Гніламёдаў, У. В. "Кожны пісьменнік стварае сваю літаратуру" / У. В. Гніламёдаў; гутарыла М. Весялуха. – Звязда. – 2016. – 27 жніўня. – С. 19.
4. Шаладонаў, І. Саборны прынцып жыцця і змагання народа ў рамане "Вайна" Уладзіміра Гніламёдава / Ігар Шаладонаў. – Роднае слова. – 2016. – С.14 – 15.

Репозиторий ВГУ